**Урок беларускай літаратуры ў 5-м класе**
( з прымяненнем тэхналогіі французскіх педмайстэрняў)

**ТЭМА:** Р. Барадулін. “Бацьку”. Памяць пра шматлікія ахвяры вайны

**МЭТА:** раскрыць аўтабіяграфічную аснову верша “Бацьку”, дапамагчы асэнсаваць яго ідэйны змест; выпрацоўваць уменне выразна чытаць вершаваны твор; выхоўваць любоў да бацькоў, павагу да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны; нагадаць падлеткам пра неабходнасць берагчы памяць пра тых, хто загінуў на вайне.

**ЭПІГРАФ:**

… Плакалі аднагодкі,
Якіх сурова назвала
Бязбацькавічамі
вайна.
Яны служылі ў арміі,
Яны спраўлялі вяселлі,
Упарта
Бацькі несустрэтыя
Сніліся зноў і зноў.

*Г.Бураўкін. “Бязбацькавічы”*

**ХОД УРОКА**

1. **Арганізацыйны момант.**
2. **Індукцыя.**

Жыццёвая дарога паэта Рыгора Барадуліна пачалася на Віцебшчыне. Нарадзіўся ён у 1935 г. Першую навуку жыцця юны Барадулін спасцігаў пад посвіст куль, аўтаматных чэргаў, выбухі снарадаў. Ішла Вялікая Айчынная вайна. Бацька Іван Рыгоравіч партызаніў. З вайны ён не вярнуўся – загінуў за пяць дзён да вызвалення роднага краю ад фашысцкай навалы. У памяці сына Іван Рыгоравіч на ўсё жыццё застаўся знешне прыгожым, дужым, працавітым і мужным. *(Выразнае чытанне верша)*

3. **Самаканструкцыя.**

Скласці асацыятыўны рад да слова “ВАЙНА” (знішчае, забівае, страты, забойства, інш.)

4. **Сацыяканструкцыя.**

Праца ў парах (групах).

**1-я пара:** -Якія былі самыя балючыя перажыванні хлопчыка-сіраты?
-Чаму салдаты, якія вярталіся з вайны, гаварылі хлопчыку кароткае: “Прыедзе…”?

**2-я пара:** -З якім пачуццём кожны раз юнак вяртаецца ў родны дом?
-Як вы разумееце выраз “Маці маладосць // Глыбей заворвалі маршчыны”? Падумайце, чаму так выказаў сваю думку паэт.

**3-я пара:** -Якія ўспаміны перадаюць незагойны боль па бацьку, што не вярнуўся з вайны?
- У якой форме напісаны верш?
- Над чым прымушае задумацца аўтар? Чаму паэт заўжды здыме шапку перад магілай невядомага салдата?

5. **Сацыялізацыя.**

Абмеркаванне пытанняў кожнай групы. Выразнае чытанне верша вучнямі.

У выніку абмеркавання прыходзім да вываду, што смерць бацькі для Рыгора Барадуліна стала непапраўнай стратай. Гэта нясцерпны боль, які ён нясе праз усё сваё жыццё. *(Вучні робяць другі выбар – выбіраюць паняцце з рада асацыяцый, якое важнае на гэтам этапе).*

6. **Разрыў.**

Вядомы беларускі крытык **Варлен Бечык**, дзяцінства якога таксама абпаліла вайна, пісаў пра гэты твор: *“Тут пра боль сказана балюча, і гэта – галоўнае. Але я не раз спрабаваў разабрацца, у чым яшчэ лірычная сіла гэтага верша. Адчуваецца ўнутраная напоўненасць. Лаканізм. Амаль баладная стрыманасць. Усё*

*пададзена ва ўсталяванай за многія гады звыкласці (колькі разоў і спадзяваўся, і пры кожным вяртанні дадому зноў думаў пра бацьку, і яшчэ, яшчэ ўсё ўспамінаў на такой душэўнай хвалі!) І ўсё вылілася з сілай духоўнага паэтычнага празарэння. Сказалася самае важнае, істотнае.* ***І таму сказанае пра сябе стала прыналежным да многіх, як іхняе ўжо асабістае і запаветнае".***

Верш Р.Барадуліна раскрывае думкі і настрой цэлага пакалення дзяцей вайны – тых, хто праз свой узрост яшчэ не мог трымаць зброю ў руках. Пакалення, для якога мінулае на ўсё жыццё стала эталонам веры ў святло вялікай праўды, у Радзіму, у сваю будучыню.

Асноўная ідэя твора заключана ў апошніх радках: А шапку я заўжды здыму // Перад магілай невядомай… – неабходна берагчы памяць аб усіх, хто загінуў на вайне, быць удзячнымі тым, хто бараніў мір іжыццё.

7. **Творчая праца.**

   Апішыце (ці намалюйце), як, на ваш погляд, павінен выглядаць помнік шматлікім ахвярам вайны.

8. **Рэфлексія.**

   Вучні складаюць сінквейн ( ключавое слова ВАЙНА )

9. **Дамашняе заданне**: вывучыць верш Р. Барадуліна на памяць.

**ДАДАТАК 1**

**1-я пара:** -Якія былі самыя балючыя перажыванні хлопчыка-сіраты?
-Чаму салдаты, якія вярталіся з вайны, гаварылі хлопчыку кароткае: “Прыедзе…”?

**2-я пара:** -З якім пачуццём кожны раз юнак вяртаецца ў родны дом?
-Як вы разумееце выраз “Маці маладосць // Глыбей заворвалі маршчыны”? Падумайце, чаму так выказаў сваю думку паэт.

**3-я пара:** -Якія ўспаміны перадаюць незагойны боль па бацьку, што не вярнуўся з вайны?
-У якой форме напісаны верш?
-Над чым прымушае задумацца аўтар? Чаму паэт заўжды здыме шапку перад магілай невядомага салдата?